***С. А. Пацыенка,***
*кандыдат культуралогіі,*
*дацэнт кафедры менеджмэнту*
*сацыякультурнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# ФАРМІРАВАННЕ ТРАДЫЦЫЙ АРЫСТАКРАТЫЗМУ НА ЗЕМЛЯХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін «арыстакратыя», які паходзіць ад грэчаскага *aristokratia* – ‘улада лепшых, знатнейшых’, мае два значэнні. У першым выпадку ён азначае форму праўлення, пры якой улада належыць заможнай і радавітай знаці, што здзяйсняе поўнае кіраўніцтва дзяржавай. У пераносным сэнсе арыстакратыя – прывілеяваныя вярхі, якія карыстаюцца асобымі правамі. У гэтым значэнні тэрмін «арыстакратыя» набліжаецца да абагуленага вызначэння эліты як вышэйшага, прывілеяванага слоя грамадства, які здзяйсняе важныя сацыяльныя і культурныя функцыі, перш за ўсё кіраўнічыя [9, с. 7].

Вытокі ўзнікнення элітарных груп у чалавечай супольнасці адносяцца да эпохі разлажэння першабытнаабшчыннага грамадства. Расійскі даследчык В. Масон адзначаў, што на апошніх этапах першабытнаабшчыннага ладу адбывалася паўсюднае выдзяленне вайсковай арыстакратыі і ідэалагічных лідэраў. У якасці важнейшай асаблівасці культуры першых цывілізацый даследчык называў яе ўнутраную дыферынцыраванасць, «звязаную з выдзяленнем элітарнай субкультуры» [7].

Арыстакратызм бярэ пачатак у асяроддзі старажытных ваяроў. Арыстакратычная культура фарміравалася ва ўмовах вайсковых дзеянняў. Як адзначыў М. Каган, «вайна была… тыпам свядомасці цэлага саслоўя, каштоўнасным сэнсам яго быцця» [4, с. 329].

Польскі філосаф М. Асоўская разглядала антычных ваяроў як носьбітаў арыстакратычнай традыцыі [8]. Вылучаючы каштоўнасныя арыентацыі вярхоў феадальнага грамадства, А. Гурэвіч адзначыў блізкасць этычных установак рыцарства з уяўленнямі варварскіх плямёнаў: «Падабенства распаўсюджваецца і на больш шырокае кола ідэалагічных і сацыяльна-псіхалагічных установак феадалаў. Паняцці «гонару», «славы», «радавітасці», прынятыя ў іх асяроддзі, таксама падаюцца непасрэдна запазычанымі з эпохі, якая папярэднічала ўзнікненню класавага строю» [3, с. 194].

Пераважная большасць даследчыкаў культуры несумненным

увасабленнем арыстакратызме лічыць рыцарства. Як адзначыў М. Бярдзяеў, «рыцарства было агромністай творчай заваёвай у маральнай свядомасці» [1, с. 106], бо пачуццё ўласнай годнасці і гонару першапачаткова сфарміравалася ў прадстаўнікоў вайсковай эліты. «Вышэйшая годнасць чалавека выкоўвалася і афармлялася ў рыцарстве і дваранстве і ад яго пайшла ў больш шырокія колы свету, яна арыстакратычнага паходжання» [1, с. 46].

Высокія патрабаванні да маральнага аблічча арыстакрата ўзніклі ва ўмовах вайны. Выкананне нормаў вайсковай этыкі і маралі адлюстроўвала ўзровень цывілізаванасці ўдзельнікаў вайсковых дзеянняў. Грамадства стварала законы паводзін для чалавека са зброяй у першую чаргу у мэтах самазахавання. Узброены чалавек быў павінен адчуваць адказнасць. Калі на ранніх стадыях развіцця грамадства паводзіны ваяра рэгуляваліся знешняй адказнасцю перад супляменнікамі, то ў больш позні перыяд гэта пачуццё стала ўнутраным абавязкам. У выніку патрабаванні да маральных якасцей ваяра былі перанесены ў сістэму каштоўнасцей арыстакратаў.

Арыстакратыя ў Вялікім Княстве Літоўскім была прадстаўлена вузкім колам прадстаўнікоў элітарнай часткі вышэйшага саслоўя. Першасным фактарам фарміравання гэтай групы стаў працэс выдзялення ў феадальным саслоўі буйных землеўласнікаў высакароднага паходжання. Тэрмін «магнат» (ад лац. *magnatus* – багаты, значны чалавек) замацаваўся за найбольш высакароднымі прадстаўнікамі феадальнай эліты.

Магнацкая культура ў Вялікім Княстве Літоўскім узнікла на грунце папярэдніх духоўных дасягненняў прадстаўнікоў вайсковай эліты і прадоўжыла арыстакратычныя традыцыі, якія складваліся на гэтых землях на працягу XI–XIII стст. Функцыю духоўнага лідэрства выконвалі высакародныя прадстаўнікі княжацка-дружынных супольнасцей удзельных княстваў.

Гэты перыяд характарызаваўся панаваннем вайсковай арыстакратыі, што было выклікана нестабільным палітычным становішчам. Прынцыпова важным момантам стала выдзяленне вайскова-элітарнай меншасці (князь, баяры), з якой пачалося фарміраванне знатных родаў. Гэта спрыяла працэсу дыферэнцыяцыі культуры княжацка-дружыннай супольнасці, якая выразна адрознівалася ад народнай культуры.

Духоўная спадчына вайсковай эліты аказала значны ўплыў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміраванне каштоўнасна-сэнсавага ядра культуры магнатаў. У выніку ў сістэму каштоўнасцяў магнатаў быў перанесены ідэал ваяра-ахоўніка, характэрныя для рыцарскай культуры паняцці «высакародства паходжання», «род», «гонар», значнасць улады і інш.

Стварэнне ВКЛ суправаджалася пастаяннымі войнамі. Вайсковая справа разглядалася як асноўны занятак уладара краіны, які «не павінен мець ні іншых намераў, ні іншых клопатаў, ні іншай справы, акрамя вайны, ваенных усталяванняў і ваеннай навукі, бо вайна ёсць адзіны абавязак, які правіцель не можа ўскласці на іншага» [6, с. 43].

Як падкрэслівае беларуская даследчыца А. А. Кілбас, у XIV – пачатку XV ст. адбывалася фарміраванне кодэксу гонару прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя: «.. рыцар павінен быць хрысціянінам, мець генеалагічнае дрэва, паводзіць сябе прыстойна… Быць ад нараджэння смелым і ахвочым да боя, мужным, устрыманым у ежы і піцці… памятаць пра свой гонар і гонар таварышаў… Рыцар, чалавек, якому даверана зброя, павінен паступаць добра і разумна» [5, с. 4].

На працягу XV ст. адбыліся якасныя змены ў асяроддзі магнатаў. Вялікія князі, зацікаўленыя ў падтрымцы арыстакратаў, актыўна надзялялі апошніх землямі і прывілеямі. У выніку радавая арыстакратыя «дапоўнілася» групай буйных землеўласнікаў «некняжацкага» паходжання.

Па меры адасаблення феадальнага саслоўя ад ваенна-служылых людзей непасрэдная вайсковая дзейнасць страчвала дамінуючую пазіцыю ў сістэме каштоўнасцей прадстаўнікоў арыстакратыі. У першай чвэрці XVI ст. стала заўважна, што магнаты перасталі імкнуцца да вайсковай службы: «А магнаты, абавязаныя пасылаць за свой кошт на вайну пэўную колькасць ваяроў, адкупаюцца ў начальніка грашыма і застаюцца дома; і гэта зусім не лічыцца ганьбай…» [2, с. 186].

XVII ст. было адзначана панаваннем ідэалогіі сарматызму, у якім сканцэнтраваліся асноўныя характарыстыкі асобы арыстакрата: старажытнасць і высакародства паходжання, мужнасць і адвага, багацце і шчодрасць. Ідэалогія сарматызму дэкларавала ўсведамленне ўласнай свабоды, культ павагі продкаў, набожнасць, шанаванне сямейных і сацыяльных сувязей, служэнне культу зброі, гасціннасць.

З пашырэннем правоў і свабод вайсковая дзейнасць магнатаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стала трансфармавацца ў грамадска-палітычную. У XVII–XVIII стст. значная колькасць прадстаўнікоў арыстакратыі здолела рэалізаваць сябе на глебе палітыкі і дыпламатыі. У сістэме каштоўнасцей з'явіліся паняцці адукаванасці і свецкасці. Магнаты атрымоўвалі добрую адукацыю, павышалі свой культурны ўзровень падчас вандровак па еўрапейскіх краінах.

У складаных умовах падзелаў Рэчы Паспалітай вайсковая дзейнасць ваяра-сармата – чалавека зброі, прадстаўніка старажытнага арыстакратычнага роду, увасаблення набожнасці, высакародства і гонару – паступова трансфармавалася ў асветніцкую дзейнасць арыстакратаў-паўстанцаў канца XVIII ст. Ідэя абароны Айчыны, адраджэння магутнага ВКЛ стала ідэалам арыстакратыі, культурны патэнцыял якой з'явіўся ўскосным фактарам такіх палітычных падзей, як паўстанні 1794 г., 1830–1831 гг., 1863–1864 гг.

---

1. *Бердяев, Н. А.* Философия неравенства. О рабстве и свободе человека. Опыт эсхатологической метафизики / Н. А. Бердяев. – М. : Наука, 1995. – 267 с.

2. *Герберштейн, С.* Записки о Московии : пер. с лат., нем. / С. Герберштейн. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та, 1988. – 429 с.

3. *Гуревич, А. Я.* Культура и общество средневековой Европы глазами современников: Exempla, XIII в. / А. Я. Гуревич – М. : Искусство, 1989. – 366 с.

4. *Каган, М. С.* Введение в историю мировой культуры : в 2 кн. / М. С. Каган. – 2-е изд. – СПб. : Петрополис, 2003. – Кн. 1 : Историографический очерк и проблемы современной методологии. Закономерности культурогенеза, этапы развития культуры традиционного типа – от первобытности к Возрождению. – 368 с.

5. *Килбас, А. А.* Культура привилегированного сословия на территории Беларуси в XIV–XVI вв. / А.А. Килбас // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. – Сер. 3 : Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Эканоміка. Права. – 1998. – № 2. – С. 3–6.

6. *Макиавелли, Н.* Избранные сочинения / Н. Макиавелли ; пер. с итал. Г. Муравьевой. – М. : Худ. лит., 1982. – 503 с.

7. *Массон, В.* Первые цивилизации / В. Массон. – Л. : Наука, 1989. – 268 с.

8. *Оссовская, М.* Рыцарь и буржуа. Исследования по истории морали / М.Оссовская ; под общ. ред. А. А.Гусейнова. – М. : Прогресс, 1987. – 528 с.

9. Словарь иностранных слов и выражений / сост. Е. Зенович. – М. : АСТ, 2006. – 784 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ